У этой истории еще будет продолжение. Одно несомненно, по имиджу действующей власти накануне выборов нанесен серьезный удар. На Поставщине пошли разговоры о сокровищах тайного бокса после того, как сенсационный материал первой опубликовала здешняя независимая газета "Сумежжа". В других странах чиновники, чем-нибудь запятнавшие свою репутацию, сразу подают в отставку. Что будет у нас, поживем — увидим. Хотя по моему разумению, высокопоставленным работникам весьма полезно для общества было бы декларировать свое имущество и доходы при каждом перемещении по горизонтали-вертикали.

**Владимир ШИК,**
**г.Поставы.**

ЗАДУМАЙЦЕСЯ...

## Беражыце дзяцей ад школьных нагрузак

Перад пачаткам новага навучальнага года спецыялісты папярэджваюць, што інтэнсіўныя вучэбныя нагрузкі ў школах могуць выклікаць развіццё функцыянальных парушэнняў у арганізме дзіцяці.

Арганізм дзіцяці фарміруецца з 6 да 18 гадоў, і менавіта ў гэты перыяд дзеці найбольш адчувальныя да ўздзеяння розных фактараў: экалагічных, сацыяльна-гігіенічных, псіхалагічных і іншых. Да ліку негатыўных уплываў Л.Матуш аднесла і празмерную вучэбную нагрузку.

Колькасць абсалютна здаровых дзяцей складае 20 — 30 працэнтаў, 50 працэнтаў адносяцца да групы рызыкі і каля 20 працэнтаў дзяцей з хранічнай паталогіяй.

Апошнім часам у рэспубліцы з'явілася шмат ліцэяў і гімназій, вучоба у якіх характарызуецца павышанымі нагрузкамі. Гэта выклікае рост колькасці дзяцей з хранічнымі паталогіямі. Аб'ёмная вучэбная нагрузка стварае сур'ёзную перашкоду для рэалізацыі біялагічных патрэбнасцяў дзіцяці — такіх, як сон, рухальная актыўнасць і знаходжанне на свежым паветры.

Міністэрства аховы здароўя дамаглося зніжэння вучэбных нагрузак у школах, ліцэях і гімназіях. Але для атрымання лепшага выніку неабходна спалучаць зніжэнне нагрузак з павышэннем рухальнай актыўнасці дзяцей.

**Вольга АСІПЕНКА.**

СИТУАЦИЯ

## Виновные в трагедии на "Немиге" установлены.

## Следствием, а что скажет суд?

27 июля 2001 года в "Народной воле" была опубликована статья под названием "Яма для правосудия". В целом хочу поддержать автора этой статьи: действительно, профессиональный уровень судей не всегда бывает на высоте. Но я хочу сказать о другом, поскольку автор неправильно дал информацию о судебном процессе, в котором участвовали родственники детей, погибших в подземном переходе станции метро "Немига". Автор сделал ссылку, что данный судебный процесс прошел, и родственникам, у которых погибли дети, присудил 100 000 рублей. Мне бы хотелось внести ясность, поскольку этой неточностью автор вызвал возмущение у близких родственников погибших.

Действительно, 5 августа 1999 года в суде Московского района г. Минска слушалось гражданское дело по иску троих родителей, чьи дети погибли 30 мая, а также одного пострадавшего. От Мингорисполкома, ГУВД Мингорисполкома, ООО "КлассКлубДжасКрафт", ОАО "Оливария" и радиостанции "Мир", принимавших участие в организации мероприятия, каждый из истцов требовал возместить ущерб в размере 4 миллиардов белорусских рублей (на тот момент сумма составляла 10.000 долларов США). Суд приостановил рассмотрение дела до окончания официального расследования, которое проводилось Прокуратурой республики. До настоящего времени данное гражданское дело не возобновлялось, так как уголовное дело только сейчас закончилось, и следствием установлены виновные лица, по халатности которых погибли люди.

Насколько мне известно, практически все родственники погибших будут предъявлять иски к виновным лицам. Будут предъявлять иски и те граждане, которые остались в живых, но получили различные увечья. Скоро уголовное дело будет передано в суд. Вместе с данным уголовным делом будут рассматриваться гражданские иски потерпевших по делу. Родственники, у которых погибли дети, будут увеличивать сумму иска. Наши юристы полагают, что государство должно выплатить как минимум 50 000 долларов США из расчета на каждого погибшего. Возможно, такая сумма иска заставит представителей власти относиться к своим служебным обязанностям с полной ответственностью, как этого требует Закон.

**Олег ВОЛЧЕК,**
**председатель общественного объединения "Правовая помощь населению".**

## Канцэрт-прэзентацыя кампакт-дыска "Беларускі ТУРБА-MIXeR"

У мінскім парку Чалюскінцаў сення адбудзецца канцэрт-прэзентацыя кампакт-дыска і аўдыёкасеты "Беларускі ТУРБА-MIXeR".

Канцэрт пачнецца а 18-й гадзіне на адкрытай танцавальнай пляцоўцы. Выпушчаны дыск "Беларускай музычнай альтэрнатывай" (БМAgroup) пры падтрымцы грамадскай арганізацыі "Маладая грамада" ў рамках мабілізацыйнай кампаніі "Выбірай!".

Трэба адзначыць, што канцэрт-прэзентацыя адбудзецца роўна за месяц да прэзідэнцкіх выбараў. Адпаведна выбраны і слаган альбома і канцэрта "Выбірай... і адрывайся!"

Свае новыя хіты прадставяць групы розных накірункаў: "NRM", "Postscriptum", "Long Play", "Палац", "Нос по ветру", "Хлоп-Ч", "Повар" і іншыя.

Усе кампазіцыі, нягледзячы на абсалютна розныя стылі, аб'ядноўвае іх танцавальнасць. Шматстылёвасць жа альбома складальнікі тлумачаць тым, што ў Беларусі наспелі ўмовы для развіцця нацыянальнай шматстылёвай масавай культуры. Паводле слоў аднаго з кіраўнікоў БМAgroup Сяргея Сахарава, гэты альбом, на якім запісана 18 кампазіцый, з'яўляецца першай спробай сабраць на адным дыску якасны беларускі "мэйнстрым" (асноўныя накірункі), самую модную музыку. "Альбом павінен адкрыць новую старонку беларускай папулярнай праеўрапейскай музыкі", — перакананы Сяргей Сахараў.

**Генадзь БАРБАРЫЧ.**

ГОЛАС "РАЦЫІ"

## Селектарнае жніво

**Беларусы паспелі ўжо прызвычаіцца да таго, што два разы на год БТ трансліруе ў жывым эфіры сапраўдны тэлеспектакль — селектарную нараду.**

Увесну кіраўніцтва краіны іграе трагікамедыю "Сяўба", а ў канцы лета — п'есу "Бітва за ўраджай". Канфлікт п'есаў звычайны — добры прэзідэнт, сапраўдны народны павадыр выступае супраць кепскіх чыноўнікаў, якія хочуць гэты народ пакрыўдзіць. У выніку дзвюх-трохгадзіннага разносу перамога застаецца за Лукашэнкам: народны заступнік абяцае разабрацца з чыноўнікамі і накарміць кожнага беларуса хлебам.

Нядаўняя селектарная нарада істотна адрознівалася ад папярэдняй, веснавой. Яна цяпер нагадвала п'есы часоў "тэорыі бесканфліктнасці", калі добрае выступала супраць яшчэ лепшага. Добрыя чыноўнікі даводзілі яшчэ лепшаму прэзідэнту, што жніво ідзе паспяхова, краіна атрымае добры ўраджай — 6 мільёнаў тон збожжа. Зерняўборачнай тэхнікі дастаткова, з палівам асаблівых праблем няма. Але зусім без канфлікту селектарная нарада, як і ўсялякая драматычная дзея, абысціся не магла. Так, Лукашэнка абурыўся з нагоды таго, што калгасы і саўгасы не хочуць прадаваць дзяржаве збожжа звыш заказу. Яны пакідаюць рэшту ўраджаю сабе, каб потым прадаць яго за мяжу. Кіраўнік краіны заклікаў прадаць усё дзяржаве, бо на знешніх рынках усё адно яго не возьмуць.

Выслухаўшы справаздачы міністра сельскай гаспадаркі і міністра фінансаў, а таксама прэзідэнта канцэрна "Белнафтахім", Аляксандр Лукашэнка ўзяўся за губернатараў. Усе кляліся выканаць і перавыканаць план па зборы ўраджаю. Мільён тон збожжа паабяцаў старшыня Берасцейскага аблвыканкама Васіль Далгалёў. "Ну, калі нарэшце Бярэсце збярэ мільён тон, то я да вас пешшу ў госці прыйду", — узрадаваўся Лукашэнка.

Яшчэ большае захапленне яго ахапіла ад паведамлення кіраўніка Магілёўскага аблвыканкама Барыса Батуры пра тое, што вобласць збярэ сёлета мільён тон збожжа.

**А.Л.:** — Я тоже хотел у вас спросить, когда Могилевщина миллион тонн даст? А то тут бывший деятель из тюрьмы только что вышел, в оппозицию подался и очерняет все и вся. Прежде всего Могилевскую область, хотя там работал. Вы знаете, о ком я говорю. Так вот: я хотел бы, чтобы Могилевщина таким, как он, утерла нос. А то у нас штабы создали... Чуть ли не единый-единственный, тоже из Могилевской области, выходец оттуда, который там все время коммунизм строил, а теперь поливает грязью. Хороший бы был ответ, если бы к президентским выборам миллион тонн!

Апрача таго, Аляксандр Рыгоравіч папрасіў губернатараў, каб яны больш пільна сачылі за парадкам на палях пасля ўборачнай кампаніі, бо смецце псуе краявіды, якія Лукашэнка бачыць, пралятаючы ў самалёце над Беларуссю.

Выслухаўшы ўсіх губернатараў і падзякаваўшы ім за плённую працу, Лукашэнка прамовіў развітальны маналог. Сказаў, што нельга змушаць сялян браць заробак не грашыма, а збожжам. Паведаміў, што вайны ў Беларусі не будзе — будзе вайна толькі на палях. Звінаваціў "апазіцыйныя" СМІ за паліванне ўладаў брудам. Папрасіў, каб з гараджанамі, што працуюць на вёсцы, разлічыліся не грашыма, а бульбай ды буракамі. І на развітанне заклікаў прафсаюзы звярнуць больш пільную ўвагу на праблемы жніва. "Там жа ёсць адзін-адзіны кандыдат — вось няхай і паклапоціцца пра сялян".

**Юлія ШАРОВА.**

ОТ ВЕЛИКОГО ДО СУЕТНОГО

## Какие нежности...

Братья Майкла Джексона не решаются участвовать в его юбилее. Жермен и Рэнди Джексоны заявили, что пока не подписали контракты о своем участии в "Звездном чествовании Майкла Джексона — поп-короля", хотя всячески поддерживают идею торжественно отметить 30-летие карьеры брата. Посвященные этому событию два концерта должны состояться 7 и 10 сентября в "Мэдисон сквер гарден". Жермена и Рэнди смущают огромные цены на билеты — до 2500 долларов, отсутствие даже намека на благотворительность, а также выступление свыше 30 крупнейших звезд поп-музыки, включая Jackson 5, в последний раз вместе выходивших на сцену в 1994 г. "Семья Джексонов так долго ждала этого совместного выступления, что не считает уместным делить столь дорогой и памятный момент с кем бы то ни было", — заявил пресс-секретарь Джексонов.

## ... при таких деньгах

Зато сам Майкл Джексон станет продюсером мультфильма The Way Of The Unicorn, The Endangered One. Главный персонаж мультика — Sailor — будет говорить его голосом. Бюджет этого проекта предположительно составит 75 миллионов долларов. Работа над полнометражным мультипликационным фильмом начнется в августе.

## Спой, Рокки, не стыдись!

Сильвестр Сталлоне собирается воссоздать свой кинохит о Рокки на Бродвее — в качестве мюзикла. Он клянется, что сам петь не будет. И надеется повторить успех Мела Брукса, перенесшего на сцену голливудский фильм "Продюсеры".

## Бедный Шуман...

В Великобритании издана биография Роберта Шумана, написанная Эриком Фредериком Йенсеном. "Не знаю, стать ли мне католиком или сумасшедшим", — пошутил как-то в письме девятнадцатилетний Шуман. Слова эти оказались пророческими. Как известно, великий композитор закончил жизнь в сумасшедшем доме. Автор книги отказывается признавать этот финал неизбежным. Йенсен приводит свидетельство побывавшей в лечебнице за год до смерти Шумана известной художницы Беттины фон Арним, шокированной тамошними условиями и методами лечения. Шуман, по ее мнению, был в лечебнице "единственным нормальным человеческим существом".

## Вуди Аллен сыграет на кларнете

В августе Вуди Аллен отправится в свое первое джазовое турне по западному побережью США вместе с Эдди Дэвисом и его New Orleans Jazz Band. Вояж будет приурочен к показу нового фильма Аллена The Curse of the Jade Scorpion. В следующие после показов дни будут проходить джазовые концерты, причем сам режиссер сыграет на кларнете. Доходы пойдут в пользу местных музыкальных организаций.

## Искушение для извращенных

Нетрадиционное решение "Ромео и Джульетты" задумано на родине Шекспира — английский режиссер Ник Фогг превратил героя и героиню в двух лесбиянок. Разумеется, это сделано для привлечения к спектаклю повышенного внимания публики. Однако режиссер уверен, что великая пьеса не пострадает от подобной трактовки. Зрители смогут увидеть новинку на одном из театральных фестивалей в Бирмингеме.

**"Турне".**

## Япония состарится быстрее всех

К такому выводу пришла группа ученых из Института системно-прикладного анализа в австрийском городе Лаксенбург. Авторы исследования разработали компьютерную программу, которая и просчитала темпы увеличения количества людей, примерную скорость замедления роста земного населения и его сокращения. Учитывая статистические данные об уровне смертности и рождаемости, миграции, некоторые моменты истории, а также возможные вспышки эпидемий и военных конфликтов демографы считают девять миллиардов человек цифрой максимального земного народонаселения. Такого уровня удастся достигнуть через 70 лет. После этого начнется спад. Уже к 2100 году на Земле будут проживать 8,4 миллиарда человек. При этом большую часть в них будут составлять граждане стран третьего мира. Точных данных о процентном соотношении черного и белого населения, однако, получить не удалось. Дело тут в том, что даже компьютер не в состоянии просчитать, какими темпами будет идти увеличение числа жителей развивающихся государств. Но тот факт, что здесь по-прежнему будет отмечаться постоянный рост населения, сомнений не вызывает. Особенный вклад в этот показатель, по мнению ученых, будут вносить страны Сахели и Южной Азии. Если развитие событий пойдет именно по такому сценарию, то прогнозируемого несколькими годами ранее специалистами ООН крупнейшего в истории скачка населения не произойдет. Таким образом, можно говорить, что человечество в XX веке пережило пик активного прироста. С 1950 по 2000 гг. на Земле прибавилось 3,5 млрд. человек. Стремительными темпами нации, преимущественно в развитых странах, начнут стариться к 2050 году. Количество людей в возрасте старше 60 лет к этому времени составит 22%. К концу столетия показатель этот увеличится до 35-40%. Самой старой страной окажется Япония. Здесь пожилые люди в 2100 году будут составлять половину от общей численности населения.

*Через сто лет половине Японии будет за шестьдесят.*

**Мария СЕЛЕЗНЕВА, "Н.И.".**

У СОСЕДЕЙ

## Правительство Польши оказывает помощь пострадавшим от наводнения

Как минимум 200 миллионов злотых (около 50 млн. долл.) выделит польское правительство до конца года на помощь пострадавшим от наводнения в Свентокшиском воеводстве Польши. В течение ближайших двух-трех лет пострадавшим будут выделены также дополнительные средства.

В настоящее время продолжается оценка ущерба, нанесенного наводнением в других регионах Польши, — от его размеров будет зависеть объем предоставляемой помощи. По неофициальным данным, в целом в Польше урон от наводнения в этом году может достичь 1 миллиарда злотых (250 млн. долл.). Финансирование помощи пострадавшим из государственного бюджета планируется провести за счет лотерейных игр. Крестьянам и мелким предпринимателям, понесшим убытки в результате наводнения, будут предоставлены дешевые кредиты и налоговые льготы. Значительные денежные суммы и другие пожертвования для пострадавших удалось собрать Польскому Красному Кресту, Польской Гуманитарной Акции, Польскому Телевидению, а также верующим во время церковных пожертвований.

Как средства массовой информации, так и многие жители страны подчеркивают, что спасательная акция в этом году была проведена гораздо более эффективно и более быстро, чем во время большого наводнения, имевшего место четыре года назад, в 1997 году. Этому прежде всего способствовала децентрализация власти в Польше, происшедшая за этот период, и значительно большая активность органов местного самоуправления, выступивших организаторами спасательной акции.

## Снижение инфляции

Годовые темпы инфляции в Польше снизились в июне с 6,9% до 6,2%. Хотя еще нет официальных данных за июль, но по прогнозам банковского сектора, в минувшем месяце также произошло снижение годовой инфляции — до 5,5%.

Цены на продукты питания в июне снизились по отношению к маю на 0,1% и в последующие месяцы ожидается их дальнейшее снижение в связи с небывалыми урожаями.

## Рост оптимизма потребителей

В июле на целых 3 пункта — до 78 пунктов — вырос показатель оптимизма потребителей, регулярно определяемый Институтом Ипсос-Демоскоп. Покупательная активность возросла на 5 процентных пунктов — до 89 пунктов. На рынке заметны явные признаки оживления спроса. Поляки стали лучше оценивать перспективы своего семейного бюджета, чаще планируют приобретение товаров постоянного потребления, охотнее используя как собственные сбережения, так и кредиты. Низкий уровень инфляции начинает стимулировать рыночное поведение населения.

## Внешняя торговля

Польские предприятия отправили на экспорт в период с января по май с.г. товаров на общую сумму 14,7 млрд. долларов. Экспорт вырос в сравнении с тем же периодом прошлого года на 17,7%. Общая стоимость импорта составила 20,7 млрд. долл., что на 3,5% больше, чем в 2000 годом. Торговый дефицит снизился в сравнении с 2000 года на 1,5 млрд. долларов.

## Доходы от туризма

По данным Польской Туристической Организации в 2000 году общие валютные поступления Польши от туризма составили 6,1 млрд. долл., достигнув того же уровня, что и годом ранее. Польша занимает 20-е место в мировом рейтинге стран с наибольшими доходами от туризма. В прошлом году Польшу посетили 17,4 млн. иностранцев, которые пробыли там не менее одних суток, а также 84,5 млн. "однодневных" туристов, главным образом, из соседних стран — Германии, Чехии, Словакии, Беларуси, России и Украины. В среднем каждый иностранный турист оставил в Польше 137 долл., при этом ежедневно иностранные туристы в среднем тратили в Польше около 30 долл. Расходы туристов, посетивших Польшу на один день, составили в среднем 44 доллара.

## Поддержка процесса интеграции с Европейским Союзом

Согласно опросу, проведенному в июле Центром исследования общественного мнения (CBOS), процесс интеграции Польши с Европейским Союзом поддерживают 53% поляков, 25% — против, а 22% — не имеют сложившегося мнения по этому вопросу. 27% мотивируют свою поддержку общими фразами, полагая, что "Польша извлечет много выгод из членства в ЕС", 19% в качестве главного аргумента в пользу членства указывают "улучшение экономической ситуации", еще 19% указывают на свободный доступ к европейскому рынку рабочей силы, 6% указывают на конкретные экономические выгоды — субсидии сельскому хозяйству, строительство автострад, развитие туризма и т.д.

## Западная экологическая помощь

Европейская Комиссия утвердила 8 очередных польских экологических проектов на общую сумму 158 миллионов евро, что является крупнейшей в истории Польши инвестицией в сфере охраны водных ресурсов и очистки сточных вод. Благодаря этому, уже через 5 лет крупнейшие польские города — Варшава, Катовице, Лодзь, Познань и Гливице — перестанут загрязнять окрестные воды.

## Предвыборные опросы

Согласно опросу, проведенному в июле Центром исследования общественного мнения (OBOP), 47% поляков намерены голосовать на парламентских выборах за левую коалицию Союз Демократических Левых Сил — Союз Труда (Sojusz Lewicy Demokratycznej — Unia Pracy), 14% — за центристскую Гражданскую Платформу (Platforma Obywatelska), 13% — за крестьянскую Польскую Народную Партию (Polskie Stronnictwo Ludowe), 10% — за правую Избирательную Акцию Солидарность Правых Сил (Akcja Wyborcza Solidarnosc Prawicy), 6% — за правую группировку "Право и Справедливость" (Prawo i Sprawiedliwosc).

## Закон о доступе к информации

Польский Сейм принял закон, обязующий органы государственной власти предоставлять любому гражданину интересующую его информацию. Исключение составляет лишь информация, являющаяся государственной тайной согласно действующему законодательству, а также информация, неразглашаемая ввиду сохранения права физических лиц на личную жизнь или коммерческой тайны. Предоставлять информацию обязаны органы государственной власти, органы местного самоуправления, фискальные органы, политические партии и профессиональные союзы. Информация должна публиковаться, среди прочего, в интернетном "Бюллетене Публичной Информации".

## Доступ в Internet

В июне доступ в Internet в Польше декларировало 19% населения страны, причем наиболее посещаемыми порталами были: Onet, Wirtualna Polska, Yahoo и Interia.

**Пресс-служба Посольства Республики Польша в Республике Беларусь.**

ДАЙДЖЕСТ

### Буш высказался по ближневосточному урегулированию

Приверженность мирному урегулированию на Ближнем Востоке подтвердил президент США Джордж Буш.

Соединенные Штаты активно вовлечены в процесс урегулирования, заявил глава Белого дома, который проводит отпуск на своем ранчо в Техасе. Он подтвердил, что находится в постоянном контакте с израильской и палестинской стороной.

Дж.Буш сообщил, что написал письмо президенту Египта Хосни Мубараку. В нем подтверждается, что ближневосточное урегулирование является одним из приоритетов американской внешней политики.

**Интерфакс.**

### Шотландские террористы готовят убийство принца Уильяма

Шотландские сепаратисты угрожают 19-летнему принцу Уильяму, внуку королевы Англии Елизаветы II. Террористы Армии национального освобождения Шотландии заявили, что в случае, если принц Уильям решится отправиться осенью в университет города Сент-Эндрю, в Шотландии, то его убьют. Сделать это планируют при помощи биологического оружия — бомбы с сибирской язвой. Таким образом шотландские националисты намереваются протестовать против того, что наследник английского престола будет учиться в Шотландии.

### "Конкорд" снова поднялся в воздух

"Конкорд", принадлежащий компании British Airways, сегодня снова поднялся в воздух. Самолет осуществил пробный перелет из лондонского аэропорта Хитроу в ирландский аэропорт Шеннон. Этот полет должен стать очередным испытанием в серии тестов, которые "Конкорд" должен пройти, чтобы его снова признали безопасным.

### В Казахстане пауки-мутанты нападают на людей

Казахские эпидемиологи полагают, что в карагандинском районе появились пауки-мутанты. В июле этого года отделом паразитологии было зафиксировано 8 случаев нападения пауков на людей. Последствия укусов переносятся довольно тяжело. У пострадавших наблюдались лихорадка, паралич поясницы, поражение почек.

### В Грузии пьяные местные жители обстреляли пограничников

Два жителя села Шатили Душетского района Грузии в состоянии алкогольного опьянения открыли огонь из автоматов по пограничникам. Перестрелка произошла в районе наблюдательного поста ОБСЕ, осуществляющего мониторинг чеченского участка границы между Грузией и Россией. Виновники инцидента были ранены и доставлены в больницу.

### Воздушный шар американского миллионера летит над океаном

Воздушный шар американского путешественника-миллионера Стива Фоссета пересек австралийское побережье и сейчас летит над южной частью Тихого океана. Шар стартовал в воскресенье в западном австралийском городе Нордхам. Его полет над "зеленым" континентом занял немного больше времени, чем предполагал путешественник.

**Lenta.ru.**

### Жертвы в Приморье

По сообщениям российских информационных агентств, в результате наводнений в Приморском крае погибло девять человек. Они погибли в наводнениях во Владивостоке, Артеме и Партизанске. Мэр столицы Приморья Владивостока Юрий Копылов заявил, что таких сильных проливных дождей в регионе не видели полвека. За последние сутки здесь выпала двухмесячная норма осадков.

### Жара в США: дети погибают в закрытых автомобилях

В США температура доходит до 45 градусов по Цельсию. Есть человеческие жертвы, в том числе и среди детей. Власти принимают меры по предотвращению смертельных исходов. Ожидается уменьшение урожайности пшеницы и сои. Высокая температура скажется на росте энергопотребления, но отключение электросетей не планируется. Спрос на прохладительные напитки вырос, но из этого вряд ли удастся извлечь значительную прибыль.

### Банкир с Уолл-стрит потерял ногу в схватке с акулой

36-летний Кришна Томпсон, банкир с Уолл-стрит, отдыхавший на Багамах, стал жертвой нападения акулы. Морской хищник атаковал Томпсона, когда он плавал. Отбившись от акулы, Томпсон сумел доплыть до берега, после чего он был доставлен в больницу. Состояние потерпевшего стабильное, но врачи опасаются, что из-за сильной потери крови мог пострадать мозг.

### Пожар в ЦРУ

В здании ЦРУ в городе Лэнгли, штат Виргиния вспыхнул пожар, в котором пострадали 10 человек. Из этого здания ведется круглосуточное управление операциями ЦРУ, и из-за пожара его пришлось эвакуировать впервые. Представитель ЦРУ сообщил, что агентство предупредило Белый Дом о необходимости эвакуации с тем, чтобы ЦРУ была обеспечена соответствующая помощь на то время, пока оно обустраивало временный центр управления операциями.

**"Би-би-си".**

### Китай намерен купить самолеты "Боинг"

Китай намерен купить самолеты "Боинг 737" на сумму два миллиарда долларов, пишет газета "Уолл стрит джорнэл".

Государственная комиссия по планированию развития Китая одобрила на прошлой неделе покупку 36 самолетов "Боинг 737-700" и "Боинг 737-800", заявил ее представитель.

"Боинг" отказывается говорить об этом возможном заказе. Какотмечает газета, он очень важен для достижения компаниейзапланированного на текущий год объема постройки самолетов вколичестве 400 штук, поскольку на конец июля было заказано всего192 самолета. Ранее авиастроительная компания заявляла, чторассчитывает на заказ Китаем 70 самолетов.

**Интерфакс.**

### Канцлер Германии не исключает членства России в НАТО

Федеральный канцлер Германии Герхард Шредер не исключает, что Россия в долгосрочной перспективе может стать членом НАТО. Тот, кто думает на длительную историческую перспективу, не должен исключать возможности членства России в НАТО, заявил глава берлинского правительства в интервью журналу "Штерн", распространенному в среду.

Такое предложение, по словам Шредера, сделала советник президента США по вопросам безопасности Кондолиза Райс. "Я полагаю, — что она сказала это по согласованию с президентом Бушем", — отметил канцлер. По его мнению, Совместный постоянный совет НАТО-Россия не может быть последним словом в отношениях между Североатлантическим союзом и Москвой.

**"Немецкая волна".**

ДУХОЎНЫ СКАРБ

# XX стагоддзе ў лёсе беларусаў

**Леанід ЛЫЧ, доктар гістарычных навук, прафесар**

## Пачатак, які абнадзейваў

У віхуры часу, пройдзенага беларусамі за ўсю сваю гісторыю, XX стагоддзе ніколі не будзе займаць шэраговага, другараднага месца. Нягледзячы на тое, што на працягу папярэдняга, XIX стагоддзя, царскі ўрад і Руская праваслаўная царква поўнасцю ігнаравалі беларускі нацыянальны інтарэс, ён не толькі не знік, а, наадварот, стаў папулярным сярод шырокіх пластоў грамадства і найперш інтэлігенцыі. Гэта яе нацыянальна актыўным колам мы абавязаны ўзнікненнем на самым старце XX стагоддзя, у 1902—1903 гг., нацыянальнай партыі леванародніцкага накірунку Беларускай Рэвалюцыйнай (годам пазней — Сацыялістычнай) Грамады. Ужо на пачатку існавання партыя не кіравалася "выступала за ўстанаўленне ў Расіі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі з супольным сеймам (Канстытуцыйным сходам) для ўсіх народаў і прадастаўленне кожнаму народу права мець свой сейм, які "вёў бы яго справы"1. У сваёй новай праграме, прынятай у студзені 1906 г. у Мінску на 2-м з'ездзе БСГ, апошняя "выказалася за ўтварэнне Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі са свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй народнасцей. Для Беларусі яна патрабавала аўтаноміі з мясцовым сеймам у Вільні"2. Пры тагачаснай палітычнай сітуацыі ў Расіі, непадзельным панаванні тут самага рэакцыйнага ў Еўропе рэжыму такая пазіцыя БСГ у пытаннях нацыянальна-дзяржаўнага развіцця беларускага народа павінна разглядацца як цалкам прагрэсіўная. Пазней, калі таго дазволяць рэальныя ўмовы, дзеячы БСГ будуць выступаць за поўную палітычную незалежнасць Беларусі ад Расіі, г.зн. у развязванні дадзенага лёсавызначальнага для беларускага народа пытання займалі больш разумную, дальнабачную пазіцыю, чым праз сто гадоў займаюць сучасныя дзяржаўныя кіраўнікі Рэспублікі Беларусь.

На старце XX стагоддзя нястрымна рос лік людзей, якія не толькі блізка да сэрца прынялі заклік вяшчальніка беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння, паэта Францішка Багушэвіча "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!", але і ўсяляк імкнуліся ўвасобіць сэнс гэтых слоў у жыццё. І такое паступова здзяйснялася, што можа пацвердзіць і арганізацыя ў 1906 годзе выданняў беларускамоўных газет "Наша доля" і "Наша ніва". Калі заснавальнікі першай і адзінай у XIX стагоддзі беларускамоўнай газеты "Мужыцкая праўда" (прычым нелегальнай) Кастусь Каліноўскі і яго паплечнікі па барацьбе з царскім рэжымам змаглі выдаць усяго толькі сем нумароў, дык "Наша ніва" выходзіла з лістапада 1906 года да жніўня 1915 года і спыніла сваю дзейнасць у сувязі з цяжкімі эканамічнымі ўмовамі ў акупаванай кайзераўскімі войскамі Вільні.

Прагрэсіўная частка інтэлігенцыі заслугоўвае высокай ухвалы, што ў XX стагоддзе яна прынесла і зрабіла вельмі папулярнай на ўсіх абсягах Айчыны ідэю аб беларускай нацыянальнай сістэме народнай адукацыі. Усё больш людзей пачыналі разумець, што заснаваная ў нас на рускіх культурна-моўных традыцыях школа адрывае маладыя пакаленні беларускага народа ад яго гістарычных традыцый, прыроднай духоўнай спадчыны, робіць няздольнымі для стваральнай нацыянальнай дзейнасці. Але ж руская школа на Беларусі акурат патрэбна была ідэолагам і непасрэдным праваднікам русіфікатарскай палітыкі. У цэнтральных дзяржаўных органах царскай Расіі, яе Міністэрстве народнай асветы працавалі высокаэрудзіраваныя людзі, якія добра разумелі, што з ўзрастаннем ролі беларускага фактару ў дзейнасці школ адсунецца на больш працяглы час поўнае сціранне этнакультурных адрозненняў карэннага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю ад рускай нацыі, таму ўсяляк тармазілі беларусізацыю школ у гэтай частцы імперыі. Далі дазвол на заснаванне беларускамоўных школ толькі з 1914/1915 навучальнага года, прычым не вышэй за пачатковыя. Старвцы ж іх з прарускай арыентацыяй мясцовыя ўлады зусім не збіраліся, тлумачачы гэта неабходнасцю канцэнтрацыі ўвагі на вырашэнні праблем, што ўзніклі ў сувязі з падзеямі першай сусветнай вайны.

Але здарылася так: на што неахвотна ішлі цэнтральныя імперскія ўлады Расіі, тое не выклікала супраціву з боку нямецкіх інтэрвентаў. Яны зусім не звярнулі ўвагі, што прагрэсіўныя дзеячы нашага краю адкрылі ў Вільні ў 1915/1916 навучальным годзе першыя беларускамоўныя школы. Неўзабаве гэта важнае нацыянальна-патрыятычнае пачынанне стала штуршком для заснавання падобных школ і ў іншых мясцінах, што знаходзіліся пад юрысдыкцыяй кайзераўскай ваеннай і грамадзянскай адміністрацыі.

## Узлёт беларускасці

Акт 25 сакавіка 1918 г. (абвяшчэнне БНР) відавочна паказаў дастаткова высокі ўзровень нацыянальна-дзяржаўнай свядомасці тагачасных авангардных колаў беларускага народа, з'явіўся пераканаўчым сведчаннем таго, што беларусы — гэта не якая-небудзь бессістэмная этнічная маса, а сапраўдная нацыя, бо толькі ў такім статусе можа ставіцца тэарэтычна і вырашацца на практыцы пытанне аб стварэнні ўласнай дзяржавы, гарантаванні ёй правоў поўнай суверэннасці. На больш высокі ўзровень, чым у сакавіку 1918 г., нацыянальна-дзяржаўная свядомасць беларускага народа ўжо больш не ўзнімалася на працягу ўсяго XX стагоддзя, у тым ліку і ў ліпені 1990 г., калі была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Бо дзеля рэалізацыі гэтага высокага статусу ўладаю вельмі мала чаго рабілася на практыцы, хаця ўмовы дазвалялі ісці на прынцыпе рашучых крокаў. Замест таго каб забяспечыць заняцце ўсіх ключавых пазіцый у органах дзяржаўнай улады і кіравання адданымі беларускай нацыянальнай ідэі людзьмі, там пакідалі чыноўнікаў, якія дзесяцігоддзямі вялі жорсткую барацьбу з гэтай ідэяй, вучылі беларусаў жыць у адпаведнасці з курсам камуністычнай партыі на зліццё культур і моваў усіх савецкіх народаў. Гэтыя чыноўнікі бальшавіцкай закваскі зусім не хацелі пераймаць вопыт стваральнай нацыянальна-дзяржаўнай дзейнасці ўладных структур Беларускай Народнай Рэспублікі, якія ў гранічна сціслы тэрмін змаглі на падлеглай ім тэрыторыі паставіць жыццё свайго народа на трывалы прыродны грунт, у значнай ступені мінімізаваць цяжкія наступствы як русіфікацыі, так і паланізацыі. Таму мы дарэмна глумім паперу, стараючыся даказаць адсутнасць усялякай рэальнай палітычнай улады ў БНР, замест таго каб паказаць, што і ў тых найскладанейшых умовах яна змагла дасягнуць шмат чаго станоўчага ў забеспячэнні статусу адзінай дзяржаўнай беларускай мовы, у стварэнні нацыянальнай сістэмы народнай адукацыі, у аднаўленні і выпрацоўцы нацыянальнай дзяржаўнай сімволікі.

Заканчэнне першай сусветнай вайны і замежнай інтэрвенцыі не прынесла асаблівай радасці беларускаму народу, за землі якога вялася жорсткая барацьба паміж Савецкай Расіяй і пілсудскай Польшчай. Скончылася гэта ў сакавіку 1921 г. падпісаннем у Рызе грабежніцкай дамовы, згодна з якой за БССР была пакінута толькі адна былая Менская губерня, а ўся астатняя беларуская этнічная тэрыторыя дасталася Расіі і Польшчы. Урады гэтых краін, несумненна, разлічвалі, што пасля такога разрабавання беларускіх земляў ні ў адной частцы з іх, у тым ліку і ў самой БССР, не будзе рабіцца аніякіх сур'ёзных крокаў па адраджэнні нацыянальнага жыцця, што нарэшце гэты славянскі народ канчаткова адыдзе ў нябыт, перастане быць косткай у горле дзяржаўных рэжымаў Расіі і Польшчы, і ў іх тады знікнуць усялякія тэрытарыяльныя прэтэнзіі адна да адной. Не, такога негатыўнага стаўлення да нацыянальнага ідэалу ў грамадстве не назіралася. У здаровых нацыянальных сілаў БССР, нягледзячы на моцныя пазіцыі тут прарасійскага фактару, хапіла і розуму, і смеласці, каб на гэтай абцятай суседзямі маленькай тэрыторыі будаваць незалежную, суверэнную дзяржаву ў адпаведнасці з гістарычнымі, культурна-моўнымі традыцыямі яе карэннага насельніцтва.

Блізкіх да БССР краін па плошчы і колькасці жыхароў тады, як і сёння, было нямала ў Еўропе, і яны паспяхова спраўляліся з развязваннем сваіх нацыянальных праблем. Адчувальных зрухаў на гэтым гістарычным шляху, хоць яны не даспадобы былі партыйнаму цэнтру ў Маскве, дамагалася і БССР. Гэта толькі сённяшнія дзяржаўныя дзеячы Рэспублікі Беларусь замест таго, каб публічна прызнаць сваю няздольнасць умела кіраваць краінай, усе эканамічныя цяжкасці звальваюць на адсутнасць у яе неабходных памераў тэрыторыі і насельніцтва і, каб застацца ва ўтульных урадавых крэслах, больш займаюць пытаннямі палітычнага аб'яднання з Расіяй, чым барацьбой з наступствамі гаспадарчай разрухі, якая ўжо паспела набыць хранічны характар.

Першыя поспехі БССР ва ўзвядзенні нацыянальнага дома станоўча адбіваліся і на жаданні жыхароў беларускіх земляў, што знаходзіліся пад уладай РСФСР, узяць чынны ўдзел у гэтай выключнай важнасці справе. Імкненне беларусаў Віцебшчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны прыналежаць да БССР набывала такую моц, што гэтага ўжо ніяк нельга было не ўлічваць у Маскве. З яе згоды двойчы (у 1924 і 1926 гг.) адбывалася аб'яднанне ўсходнебеларускіх земляў з БССР, што значна павысіла яе аўтарытэт у складзе СССР. Але яшчэ больш садзейнічала гэтаму палітыка яе ўрада па арганізацыі жыцця рэспублікі на ўласным нацыянальным культурна-моўным падмурку. Да гэтай стваральнай працы пажадалі далучыцца нават некаторыя палітычныя дзеячы Беларускай Народнай Рэспублікі, што знаходзіліся ў эміграцыі. Шчыра радаваліся размаху нацыянальна актыўных колаў БССР па пераадоленні цяжкіх вынікаў русіфікацыі і паланізацыі беларусы, што не па сваёй волі апынуліся пад уладай Польшчы. Сваю радасць яны штодзённа падмацоўвалі канкрэтнымі практычнымі дзеяннямі па забеспячэнні больш-менш нармальнай дзейнасці беларускамоўных школ, выданні беларускіх газет, часопісаў і кніг, арганізацыі розных масавых культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў у духу беларускіх нацыянальных традыцый. Усё гэта дасягалася праз пераадоленне неверагодна вялікіх цяжкасцяў, якія спрэс чыніліся дзяржаўнымі ўладамі Польшчы. Яе палітыкі і блізкая ім частка інтэлігенцыі выдатна разумелі, калі ва "ўсходніх крэсах", г.зн. на беларускіх землях, не ўдасца канчаткова выціснуць з ужытку іх прыродную культуру і мову: захаваецца тут этнакультурная адметнасць карэннага насельніцтва, і яно заўжды будзе чужацца польскіх парадкаў, шукаць шляхі да ўз'яднання з усходнімі беларусамі і стварэння ўласнай нацыянальна незалежнай дзяржавы.

## Сакрэт 20-х гадоў

